9. Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення / А. Станкевіч. – Вільня: Шлях моладзі, 1935 – 128 с.

## СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ІНСТЫТУЦЫЙНЫХ ОРГАНАЎ САЦЫЯЛЬНАГА ПАРТНЁРСТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ Ў 1990-я гг.

А.А. Дубовік, ст. выкладчык

З абвяшчэннем у верасні 1991 г. незалежнасці Рэспублікі Беларусь і пачаткам пераходу да рыначнай эканомікі наступіў новы перыяд у сацыяльна-працоўных адносінах. Пачала складвацца сістэма ўзаемаадносін органаў дзяржаўнага кіравання з прафсаюзамі і аб'яднаннямі прадпрымальнікаў, заснаваная на прынцыпах сацыяльнага партнёрства. 15 снежня 1992 г. Законам Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у КЗаП Рэспублікі Беларусь» у беларускае заканадаўства быў уведзены тэрмін «сацыяльнае партнёрства». У арт. 1 Закона адной з задач заканадаўства аб працы называлася «развіццё сацыяльнага партнёрства паміж работнікамі і наймальнікамі» [1].

Раней, у прынятай 10 кастрычніка 1991 г. пастанове Савета Міністраў «Аб укараненні ў практыку работы заключэння тарыфных эканамічных пагадненняў» было даручана Дзяржаўнаму камітэту па працы, Дзяржэканамплану, Міністэрству юстыцыі з удзелам аб'яднанняў прадпрымальнікаў і Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) падрыхтаваць і да канца года ўнесці ў Савет Міністраў прапановы па стварэнню ў рэспубліцы сістэмы сацыяльнага партнёрства ў галіне сацыяльна-працоўных адносін [2, арк.75].

Трэба адзначыць, што фарміраванне сацыяльна-партнёрскіх адносін у Беларусі і іншых краінах СНД у 90-х гг. ХХ ст. адбывалася ва ўмовах вострага крызісу ўсёй сістэмы грамадскіх адносін. Станаўленне рыначнай эканомікі абумовіла змяненне падыходаў да рэгулявання працоўных адносін. На першае месца выходзяць калектыўна-дагаворныя метады рэгулявання. Патрэба ў абароне інтарэсаў працаўнікоў была матывам стварэння сістэмы сацыяльнага партнёрства, якое стала адным з важнейшых кірункаў сацыяльнай палітыкі дзяржавы.

Сістэма сацыяльнага партнёрства, якая фарміравалася ў гэты перыяд, ўключала ў сябе заканадаўчую базу як аснову яго

функцыянавання і развіцця. Прынцыповыя асновы сацыяльнага партнёрства былі замацаваны ў арт. 14 прынятай 15 сакавіка 1994 г. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дзе адзначаецца, што адносіны ў сацыяльна-працоўнай сферы паміж органамі дзяржаўнага кіравання, аб’яднаннямі наймальнікаў і прафесійнымі саюзамі ажыццяўляюцца на прынцыпах сацыяльнага партнёрства і ўзаемаадносін бакоў [3, с.7]. Гарантам аховы канстытуцыйных правоў сацыяльных партнёраў з’яўляецца створаны ў 1994 г. Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь.

З 1 студзеня 2000 г. уступіў у дзеянне прыняты ў чэрвені 1999 г. Палатай прадстаўнікоў, адобраны Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу і зацверджданы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь (ПК). У раздзеле IV кодэкса змешчаны 48 артыкулаў, якія рэгулююць адносіны, звязаныя з сацыяльным партнёрствам, заключэннем калектыўных дагавораў і пагадненняў [4, с. 150-165]. Артыкул 352 ПК вызначае сацыяльнае партнёрства як форму «узаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання, аб’яднанняў наймальнікаў, прафесійных саюзаў і іншых прадстаўнічых органаў працаўнікоў, упаўнаважаных у адпаведнасці з актамі заканадаўства прадстаўляць іх інтарэсы … пры распрацоўцы і рэалізацыі сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы, заснаваную на ўліку інтарэсаў розных пластоў і груп грамадства ў сацыяльна-працоўнай сферы праз перамовы, кансультацыі, адмову ад канфрантацыі і сацыяльных канфліктаў» [4, с. 150]. Згодна з арт. 364 ПК, к прадмету калектыўна-дагаворнага рэгулявання адносіцца шырокае кола пытанняў, узнікаючых ў сацыяльна-працоўнай сферы. Гэта, перш за ўсё, нормы і абавязацельствы, якія забяспечваюць аплату працы, гарантыі занятасці, працягласць працоўнага часу і часу адпачынку, пытанні, звязаныя з паляпшэннем матэрыяльна-бытавога становішча працаўнікоў, з прадастаўленнем дадатковых гарантый і ільгот пэўным катэгорыям працаўнікоў – усяго 18 пунктаў [4, с. 154].

Важнейшым элементам сістэмы сацыяльнага партнёрства з’яўляюцца інстытуцыйныя органы, у рамках якіх ажыццяўляецца ўзаемадзеянне суб’ектаў сацыяльнага партнёрства – прадстаўнікоў наймальнікаў, прафсаюзаў і дзяржаўнай улады. Іх фарміраванне у Рэспубліцы Беларусь пачалося ў першай палове 1990-х гг. У кастрычніку 1992 г. ФПБ выступіла з ініцыятывай стварэння

Пагадняльнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях з прадстаўнікоў урада, наймальнікаў і прафсаюзаў. 25 лютага 1993 г. была прынята пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб стварэнні Пагадняльнага савета Рэспублікі Беларусь па працоўных і сацыяльных пытаннях», у якой прызнавалася мэтазгодным стварэнне Пагадняльнага савета ў колькасці 27 чалавек, па 9 прадстаўнікоў з кожнага боку, былі адобраны Палажэнне аб Пагадняльным савеце і Рэгламент яго працы, узгодненыя з сацыяльнымі партнёрамі. У якасці сустаршыні ад Савета Міністраў рэкамендаваны ў склад Пагадняльнага савета першы намеснік прэм'ер-міністра М.У. Мяснікові. З улікам рознага колькаснага складу прафсаюзных і прадпрымальніцкіх структур, у Пагадняльным савеце былі чатыры прадстаўнікі ад ФПБ, па аднаму прадстаўніку ад 5 іншых прафсаюзаў і па аднаму прадстаўніку ад 9 прадпрымальніцкіх саюзаў Беларусі. Для арганізацыі бягучай працы Пагадняльнага савета ствараўся ў структуры Кіраўніцтва Справамі Савета Міністраў рабочы сакратарыят з трох чалавек [5].

Не менш важнае значэнне ў сістэме сацыяльнага партнёрства маюць органы, якія выконваюць функцыі па ўрэгуляванню рознагалоссяў і калектыўных працоўных спрэчак шляхам прыміральных працэдур. 28 красавіка 1994 г. пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 289 быў створаны Рэспубліканскі працоўны арбітраж (РПА), яго галоўнай задачай з'яўляўся разгляд калектыўных працоўных спрэчак (канфліктаў), узнікаючых на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях [6].

Важным крокам у фарміраванні арганізацыйнай асновы партнёрскіх адносін стаў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 1995 г. № 278 «Аб развіцці сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь», у якім развіццё сістэмы сацыяльнага партнёрства названа «адной з важнейшых дзяржаўных задач» [7]. У адпаведнасці з гэтым Указам быў створаны Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях (НСПСП), заснаваны абласныя, гарадскія, раённыя і галіновыя пагадняльныя камісіі, перайменаваныя пазней у рэгіянальныя саветы па працоўных і сацыяльных пытаннях. На ўзроўні прадпрыемства ў адпаведнасці з законам «Аб калектыўных дагаворах і пагадненнях» стваралася камісія, якая назірала за выкананнем калдагавора.

Першае пасяджэнне НСПСП адбылося 9 кастрычніка 1995 г. пад старшынствам Каардынатара савета, кіраўніка РПА І.І. Дзіковіча. Былі разгледжаны пытанні аб сустаршынях і персанальным складзе НСПСП, аб рэгламенце яго працы, аб выкананні пратаколу сумеснага пасяджэння прадстаўнікоў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх аб'яднанняў наймальнікаў і прафсаюзаў ад 8 жніўня 1995 г. Сустаршынямі НСПСП былі зацверджаны намеснік прэм'ер-міністра С.С. Лінг, прэзідэнт Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі (БНПА) М.Ф. Лаўрыновіч, старшыня ФПБ У.І. Ганчарык [8, арк. 74-76].

На другім пасяджэнні НСПСП, якое адбылося 16 лістапада 1995 г., былі разгледжаны пытанні "Аб адзінай тарыфнай сетцы, памеры мінімальнай заработнай платы і тарыфнай стаўкі першага разраду работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый, фінансіруемых з бюджэту, па тарыфных разрадах Рэспублікі Беларусь", "Аб распрацоўцы праекта Генеральнага пагаднення паміж Кабінетам Міністраў, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 1996 г." і іншыя [8, арк. 140]. У мэтах узаемнай увязкі дадатковых сацыяльных гарантый, прадугледжаных калдагаварамі і пагадненнямі, НСПСП рэкамендаваў прымаць галіновыя тарыфныя і тэрытарыяльныя пагадненні пасля падпісання Генеральнага пагаднення, а калдагаворы – пасля галіновых і мясцовых пагадненняў.

На разгляд НСПСП, пасяджэнні якога праводзіліся не радзей, чым штоквартальна, выносіліся актуальныя праблемы сацыяльна-працоўных адносін. Галоўная ўвага надавалася падрыхтоўцы, прыняццю і рэалізацыі Генеральнага пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў. Рэгламент работы НСПСП быў зацверджаны 26 кастрычніка 1995 г. і ў новай рэдакцыі – 27 жніўня 1999 г. Ён рэгуляваў дзейнасць НСПСП на аснове Палажэння, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 1999 г., № 252 [9]. Пасяджэнні праводзіліся не радзей, чым адзін раз у квартал. Парадак дня наступнага пасяджэння вызначаўся, як правіла, на папярэднім пасяджэнні, па прапанове аднаго з бакоў маглі ўносіцца дадатковыя пытанні. Пры неабходнасці абмеркавання неадкладных пытанняў маглі праводзіцца пазачарговыя пасяджэнні, але не болей аднаго ў месяц. Кіраўніцтва дзейнасцю НСПСП ажыццяўляў

старшыня, які выбіраўся з ліку сустаршынь і ажыццяўляў гэтыя функцыі да выбрання на чарговым пасяджэнні новага старшыні. Старшыня каардынаваў працу НСПСП, вызначаў дату і месца яго правядзення. Пасяджэнне лічылася правамоцным, калі на ім прысутнічала больш за палову прадстаўнікоў ад кожнага боку. Для больш глыбокага вывучэння і прапрацоўкі ўзнікшых праблем маглі запрашацца высокакваліфікаваныя спецыялісты ў якасці кансультантаў і экспертаў. Пасяджэнні былі, як правіла, адкрытыя, на іх маглі прысутнічаць прадстаўнікі СМІ. У некаторых выпадках па рашэнню НСПСП маглі быць закрытыя пасяджэнні.

У снежні 1995 г. і ў 1996 г. на пасяджэннях НСПСП былі абмеркаваны пытанні: “Аб неадкладных мерах па стабілізацыі фінансава-эканамічнага становішча ў прамысловасці”; “Аб умовах аплаты працы кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў”; “Аб мерах падтрымкі дзяржавай і прамысловасцю сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і фермерскіх гаспадарак у правядзенні вясенне-палявых работ”; “Аб павышэнні ролі аб’яднанняў наймальнікаў у сістэме сацыяльнага партнёрства”; “Аб выніках выканання Генеральнага пагаднення за I квартал 1996 г.”; “Аб забяспячэнні на прадпрыемствах і арганізацыях рэспублікі права работнікаў на пенсію за працу з асаблівымі умовамі працы”; Аб канцэпцыі рэфармавання падатковай сістэмы рэспублікі ў 1997-1998 гг.; “Аб запазычанасці па заработнай плаце і забяспячэнні паўнаты выплаты адпускных работнікам адукацыі”; Аб ходзе выканання Генеральнага пагаднення на 1996 г.”; “Аб распрацоўцы Генеральнага пагаднення паміж Кабінетам Міністраў, рэспубліканскімі аб’яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 1997 г.” і іншыя [ 10].

Важным крокам у вызначэнні перспектыў партнёрскіх адносін у сацыяльна-працоўнай сферы стала распрацаваная з удзелам прафсаюзаў і зацверджаная НСПСП 12 сакавіка 1997 г. Канцэпцыя развіцця сістэмы сацыяльнага партнёрства і праграма мер па яе рэалізацыі [11, арк. 3-14]. У адпаведнасці з ёю пачалася распрацоўка праекта Закона «Аб сацыяльным партнёрстве ў Рэспубліцы Беларусь». Аднак па шэрагу аб’ектыўных і суб’ектыўных прычын гэта работа не атрымала працягу і заканчэння, закон дагэтуль не прыняты.

Акрамя таго, на пасяджэннях НСПСП у 1997 г. былі разгледжаны пытанні “Аб удасканальванні сістэмы аплаты працы ў

галінах эканомікі”; “Аб заўвагах і прапановах Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай па праекту Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь”; “Аб ходзе аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння насельніцтва ў першай палове 1997 г.”; “Аб заўвагах і прапановах па праекту Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь”; “Аб распрацоўцы праекта Генеральнага пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб’яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 1998 – 2000 гг.” і іншыя [11].

У 1998 г. на пасяджэннях НСПСП, сярод іншых, былі абмеркаваны пытанні “Аб ходзе рэалізацыі Нацыянальнай жыллёвай праграмы Рэспублікі Беларусь”, “Аб выкананні ў першым квартале 1998 г. прагнозных паказчыкаў узроўню інфляцыі і росту заработнай платы ў галінах эканомікі, прадугледжаных Генеральным пагадненнем паміж Урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб’яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 1998 – 2000 гг.”; “Аб парадку рэгулявання аплаты працы на аснове тарыфных пагадненняў і калектыўных дагавораў”; “Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь “Аб устанаўленні і парадку павышэння мінімальнага памеру аплаты працы і памераў дзяржаўных сацыяльных выплат насельніцтву”; “Аб ходзе рэалізацыі Канцэпцыі аплаты працы ў Рэспубліцы Беларусь ва ўмовах рыначных адносін і аб удасканальванні арганізацыі аплаты працы ў галінах эканомікі”; “Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у рэгламент Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях” [12].

У склад НСПСП, дзейнасць якога рэгулявалася Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 1999 г. “Аб Нацыянальным савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях”, уваходзілі па 11 прадстаўнікоў ад кожнага боку, уключаючы аднаго сустаршыню, з правам рашаючага голасу. Кіраўніцтва дзейнасцю НСПСП ажыццяўляў старшыня, які выбіраўся на пасяджэнні савета з ліку сустаршынь [9].

Урад Рэспублікі Беларусь дэлегаваў у склад НСПСП сваіх паўнамочных прадстаўнікоў. З лістапада 1996 г. па 7 мая 1998 г. сустаршынёй НСПСП ад урада з’яўляўся першы намеснік прэм’ер-міністра П.П. Пракаповіч, затым віцэ-прэм’ер У.П. Замяталін, якога змяніў 12 лістапада 1999 г. першы намеснік прэм’ер-міністра В.Б. Даўгалёў, а ў 2000 г. – першы намеснік прэм’ер-міністра А.У. Кабякоў [11, арк.1-2; 13, арк.70].

У склад НСПСП у другой палове 1990-х гг. уваходзілі прадстаўнікі ўрада: міністр эканомікі Г.П. Бадзей (са снежня 1996 г. У.М. Шымаў), міністр сацыяльнай абароны В.Б. Даргель, міністр працы А.В. Сасноў (са снежня 1996 г. І.А. Лях), міністр фінансаў П.У. Дзік (з сакавіка 1997 г. М.Ф. Румас), старшыня Дзяржаўнага падатковага камітэта М.М. Дзямчук, міністр прамысловасці А.Д. Харлап, першы намеснік, потым міністр статыстыкі і аналізу У.І. Зіноўскі, кіраўнікі іншых дзяржаўных органаў В.Ф. Некрашэвіч, Ю.Д. Мароз, В.Ю. Сташкевіч. Склад прадстаўнікоў ад рэспубліканскіх аб’яднанняў прафсаюзаў вызначаўся іх кіруючымі органамі прапарцыянальна колькасці членаў гэтых аб’яднанняў. У другой палове 1990-х гг. у склад НСПСП уваходзілі кіраўнікі ФПБ У.І. Ганчарык, Ф.П. Вітко, старшыні рэспубліканскіх камітэтаў буйнейшых галіновых прафсаюзаў А.У. Бельская, А.І. Бухвостаў, Л.Ф. Грушэцкая, А.Ф. Федыніч, Т.І.Чобатава, Г.Г. Южаніна, А.І.Ярашук, старшыня Магілёўскага аб’яднання прафсаюзаў А.Ц. Любчанка, прадстаўнік Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) У.М. Макарчук (з лістапада 1999 г. В.С. Бабаед). Склад прадстаўнікоў ад рэспубліканскіх аб’яднанняў наймальнікаў зацвярджаўся на прэзідыуме Беларускай канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў (наймальнікаў). У 1995–1999 гг. членамі НСПСП выбіраліся: Т.П. Быкава, Ю.А. Весялоў, У.М. Карагін, Э.Ч. Кісель, В.А.Емельянаў, С.А.Пірожнік, М.А.Стральцоў, В.Б. Вернікоўскі, М.В. Лявонаў, В.М. Хамярчук [13, арк. 70,74 ].

Пры НСПСП былі створаны рабочая група і пагадняльная камісія для вядзення калектыўных перамоў па заключэнню Генеральнага пагаднення, група экспертаў па прымяненню міжнародных працоўных норм МАП.

У 1999 г. на пасяджэннях НСПСП разглядаліся пытанні “Аб змяненнях і дапаўненнях на 1999 г. у Генеральнае пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб’яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў”; “Аб прапановах па ўдасканальванню існуючай сістэмы прымянення штрафных санкцый да прадпрыемстваў і арганізацый”; “Аб праекце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Аб Нацыянальным савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях”; “Аб праекце Канцэпцыі аплаты працы ў

Рэспубліцы Беларусь”; “Аб тыпавым палажэнні аб галіновым тэрытарыяльным (абласным, гарадскім, раённым) савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях”; “Аб ходзе выканання мерапрыемстваў па рэалізацыі Генеральнага пагаднення на 1998–2000 гг., а таксама галіновых тарыфных і мясцовых пагадненняў, калектыўных дагавораў; “Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў на 2000 г. у Генеральнае пагадненне на 1998–2000 гг.” і іншыя [13, арк.6а].

Такая ж праца праводзілася на рэгіянальным і галіновым узроўнях. Напрыклад, для выканання рашэння НСПСП ад 30 чэрвеня 1999 г. “Аб Тыпавым палажэнні аб галіновым тэрытарыяльным (абласным, гарадскім, раённым) савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях” у Мінскай вобласці ў жніўні – кастрычніку 1999 г. былі выбраны ад прафсаюзных арганізацый, прадпрыемстваў саветы па працоўных і сацыяльных пытаннях. Пастановамі выканкама Савета Мінскага абласнога аб’яднання галіновых прафсаюзаў ад 5 і 26 кастрычніка 1999 г. “Аб дэлегаванні ад прафсаюзаў прадстаўнікоў у раённыя і гарадскія саветы па працоўных і сацыяльных пытаннях” у кожны савет было накіравана па 5 прадстаўнікоў прафсаюзаў, у тым ліку, адзін сустаршыня (у большасці выпадкаў у гэтай якасці дэлегаваны старшыні раённых камітэтаў прафсаюза работнікаў АПК) [14]. У мэтах павышэння іх ролі ў вырашэнні рэгіянальных сацыяльна-эканамічных задач выканкам Савета Мінскага абласнога аб’яднання галіновых прафсаюзаў пастанавіў правесці 23 лістапада 1999 г. семінар-нараду актыву Мінскай вобласці, выбранага ў склад раённых і гарадскіх саветаў па працоўных і сацыяльных пытаннях [14, арк.70].

29 чэрвеня 1999 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 348 «Аб Рэспубліканскім працоўным арбітражы» было зацверджана Палажэнне аб Рэспубліканскім працоўным арбітражы [13, с. 670-675]. Старшынёй РПА быў І.І. Дзіковіч. Пазней яго змяніў на гэтай пасадзе В.А. Чарамісін. З удзелам РПА, яго тэрытарыяльных падраздзяленнняў разглядаліся калектыўныя працоўныя спрэчкі.

Аднак, нягледзячы на тое, што сістэма сацыяльнага партнёрства ў нашай краіне інстытуцыйна афармілася ў 1990-я гг., было б няправільна гаварыць аб тым, што яна дастаткова дакладна функцыянавала і апраўдвала сваё прызначэнне. Укараненне прынцыпаў сацыяльнага партнёрства ў рэспубліцы праходзіла з

відавочнымі хібамі. У прамове на пазачарговым IV з’ездзе ФПБ (верасень 2002 г.) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка адзначыў, што «існуючая трохбаковая сістэма сацыяльнага партнёрства на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях сябе апраўдала. Але ў апошні час гэта сістэма прабуксоўвала. Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях бяздзейнічаў, яго пасяджэнні праводзіліся нерэгулярна. І такое становішча недапушчальна. Асноўныя задачы органаў дзяржаўнай улады, прафсаюзаў і аб’яднанняў наймальнікаў супадаюць» [15]. Згодна з Палажэннем, Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях (НСПСП) павінен быў склікацца не радзей аднаго разу ў квартал. Аднак у 2001–2002 гг. ён не збіраўся больш за год, у многім з-за неканструктыўнай пазіцыі тагачаснага кіраўніцтва ФПБ.

Сітуацыя пачала карэнным чынам мяняцца з выбраннем летам 2002 г. новага кіраўніцтва ФПБ на чале з Л.П. Козікам. У жніўні 2002 г. пасля працяглага перапынку аднавіў працу НСПСП. Сустаршынёй Нацыянальнага савета ад урада з’яўляўся першы намеснік прэм’ер-міністра С.С. Сідорскі, з назначэннем якога ў снежні 2003 г. прэм’ер-міністрам у склад НСПСП быў уведзены і выбраны сустаршынёй першы намеснік прэм’ер-міністра У.І. Сямашка. Ад прафсаюзаў сустаршынёй НСПСП з 2002 г. з’яўляецца старшыня ФПБ Л.П. Козік. Сустаршынёй ад аб’яднанняў наймальнікаў выбіраўся кіраўнік Канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў (наймальнікаў) М.А. Стральцоў, а з 2007 г. былы міністр прамысловасці А.Дзм. Харлап.

Выступаючы 16 верасня 2010 г. на шостым з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка падкрэсліў, што ў краіне атрымала высокае развіццё сацыяльнае партнёрства. “Вынікі сведчаць самі за сябе. – адзначыў ён. – На ўсіх узроўнях створаны і актыўна дзейнічаюць саветы па працоўных і сацыяльных пытаннях. Іх колькасць у параўнанні з 2003 годам павялічылася ў два разы”. Расце колькасць тарыфных галіновых і мясцовых пагадненняў, калектыўных дагавораў. Цяпер у рэспубліцы заключана 530 пагадненняў і больш за 18 тысяч калектыўных дагавораў. Выкарыстанне новых арганізацыйных падыходаў дало магчымасць забяспечыць эфектыўную канструктыўную работу Нацыянальнага савета па

працоўных і сацыяльных пытаннях. Праз гэты савет прафсаюзы ўдзельнічаюць у вырашэнні ўсіх ключавых пытанняў і праблем сацыяльна-працоўнай сферы. На рэгулярнай аснове заключаюцца генеральныя пагадненні паміж урадам, прафсаюзамі і рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў. Як падкрэсліў Прэзідэнт, у ходзе іх заключэння "часам разгараюцца гарачыя спрэчкі, але, галоўнае, заўсёды знаходзіцца кампраміс" [16]. А.Р. Лукашэнка абазначыў важнасць таго, што ў апошнія гады даволі шырока пачало выкарыстоўвацца калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін. Значна ўзрасла роля менавіта такога дыялога паміж наймальнікамі і работнікамі. У выніку многія пытанні вырашаюцца непасрэдна ў працоўных калектывах.

Сістэма сацыяльнага партнёрства і яго механізмы ў сучасных умовах даюць магчымасць вырашаць спрэчныя пытанні не шляхам забастовак і мітынгаў, а за сталом перамоў, шляхам дасягнення ўзаемнай згоды. Сацыяльна-працоўнае партнёрства адыгрывае стабілізуючую ролю, садзейнічае ўстойлівасці, сацыяльна-эканамічнай і палітычнай стабільнасці беларускага грамадства. Разам з тым лічым мэтазгодным павышэнне статуса Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях. Наспела неабходнасць прыняцця законаў Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльным партнёрстве» і «Аб аб'яднаннях наймальнікаў». Для павышэння ролі прафсаюзаў неабходна вяртанне ім права заканадаўчай ініцыятывы.

Выкарыстаная літаратура

1. О внесении изменений и дополнений в Кодекс Законов о труде Республики Беларусь: Закон Республики Беларусь от 15 декабря 1992 г. // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. – 1993. – № 4. – Ст. 36.

2. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ) – Ф. 7. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. – Воп. 10. – Спр. 2458. Дакументы да пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 1991 г.

3. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.).– Минск: Амалфея, 2005. – 48 с.

4.Трудовой кодекс Республики Беларусь: принят Палатой представителей 8 июня 1999г.: одобрен Советом Республики 30 июня

1999 г., с изменениями и дополнениями по состоянию на 2 апреля 2009 г. – Минск: Национальный центр правовой информации Респ. Беларусь, 2009. – 239 с.

5. Збор пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь. – 1994. – № 12. – Арт. 228.

6. О создании Согласительного совета Республики Беларусь по трудовым и социальным вопросам: Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 25 февраля 1993 г. //Деловая орбита. – 1993. – № 4. – С. 7.

7. О развитии социального партнерства в Республике Беларусь: Указ Президента Республики Беларусь от 15 июля 1995 г., № 278 // Сборник действующих нормативных правовых актов Президента Республики Беларусь: 1994-2000. – Минск: Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2001. – С.651-652.

8. НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 12. – Спр. 1823. – Арк. 74–76.

9. О Национальном совете по трудовым и социальным вопросам: Указ Президента Респ. Беларусь от 5 мая 1999 г., №252 // Сборник действующих нормативных правовых актов Президента Респ. Беларусь: 1994-2000.– Минск: Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2001. – С. 666–670.

10. НАРБ. – Ф.7. – Воп. 12. – Справа. 2130. Дакументы па пытаннях працы, заработнай платы і працоўнага заканадаўства. – Арк. 84-88, 174-179, 210.

11. Архіў ФПБ. – Ф.1. – Воп. 17. – Справа 332. Дакументы Нацыяльнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, 1997 г.

12. Там жа. – Ф.1. – Воп. 17. – Справа 391. Дакументы Нацыяльнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, 1998 г.

13. Там жа. – Ф.1. – Воп. 17. – Справа 451. Дакументы Нацыяльнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, 1999 г.

14. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 2313. – Воп. 1. – Спр.2043. Пратаколы пасяджэнняў выканкамаў саветаў аб’яднання арганізацый галіновых прафсаюзаў г. Мінска і Мінскай вобласці, 1999 г. – Арк.14, 59,60,70.

15. Беларускі час. – 2002. – 27 верасня. – С. 3.

16. Беларускі час. – 2010. – 17 верасня. – С. 1-3.